падпарадкавання і 37 друкарняў абласнога падпарадкавання, а таксама выдавецтвы «Беларускі Дом друку» (Мінск), «Сож» (Гомель).

**Абагульнім і запомнім.** Асноўным фактарам развіцця дрэваапрацоўкі з'яўляецца сыравінны. Беларусь спецыялізуецца на вытворчасці фанеры, ДВП, ДСП, мэблі, паперы і кардону.

1. Назавіце асноўныя фактары размяшчэння дрэваапрацоўчай, мэблевай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці. 2. Як можна ацаніць забяспечанасць Беларусі сыравінай для галіны? 3. Якія віды прадукцыі вырабляе дрэваапрацоўчая прамысловасць?

4. Якія, на ваш погляд, перспектывы развіцця дрэваапрацоўчай прамысловасці? 5. Чаму ў Беларусі пашыраюць вытворчасць паперы і кардону?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Да вас прыехалі сябры з іншай краіны і хочуць набыць мэблю. Распрацуйце для іх буклет «Брэнды мэблевай прамысловасці Беларусі».

## § 38. Геаграфія лёгкай прамысловасці

***Узгадваем.*** *Якая сыравіна выкарыстоўваецца ў лёгкай прамысловасці?*

**Структура і фактары размяшчэння лёгкай прамысловасці.** Па характары выпускаемай прадукцыі ў складзе галіны вылучаюцца тэкстыльная, швейная, гарбарная вытворчасць (мал. 151). Прадпрыемствы лёгкай прамысловасці арыентаваны на наяўнасць працоўных рэсурсаў, таму часта ствараюцца ў прамысловых цэнтрах з вялікім попытам на мужчынскую працу, каб заняць працай жанчын. У Беларусі такімі цэнтрамі можна назваць Салігорск, Жодзіна і інш. Лёгкая прамысловасць накіравана на задавальненне попыту насельніцтва. Найбольш спрыяльныя ўмовы для развіцця лёгкай прамысловасці маюць тыя рэгіёны, якія забяспечаны працоўнымі рэсурсамі і адначасова з'яўляюцца спажыўцамі гатовай прадукцыі.

| Лёгкая прамысловасць | |
|---|---|
| Тэкстыльная вытворчасць | тканіны (баваўняныя, шаўковыя, ваўняныя, льняныя), ніткі, дываны і дывановыя вырабы |
| Швейная вытворчасць | адзенне, галаўныя ўборы, вырабы з футра, трыкатажныя вырабы, панчохі, шкарпэткі |
| Вытворчасць скур, вырабаў са скуры, абутку | скура, скураная вопратка, пальчаткі, сумкі, абутак |

Мал. 151. Структура лёгкай прамысловасці Беларусі

Важным фактарам размяшчэння прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці з’яўляецца выгаднае эканоміка-геаграфічнае становішча. *Чаму гэты фактар важны для развіцця лёгкай прамысловасці ў Беларусі?*

Больш за 80 % агульнага аб’ёму вытворчасці тканін, адзення, абутку ў Беларусі прыходзіцца на прадпрыемствы канцэрна «Беллегпрам». У рэгіянальным разрэзе прадпрыемствы лёгкай прамысловасці размешчаны па краіне раўнамерна, аднак лідарства ў вытворчасці належыць Віцебскай вобласці і г. Мінску (мал. 152).




Мал. 152. Рэгіянальная структура вытворчасці тэкстыльных вырабаў, адзення, вырабаў са скуры і футра, 2017 г., %



Мал. 153. Прадпрыемства «Блакіт», г. Баранавічы

**Геаграфія тэкстыльнай вытворчасці.** Тэкстыльная вытворчасць з’яўляецца самай буйной па аб’ёме выпрабляемай прадукцыі і колькасці занятых у лёгкай прамысловасці і налічвае больш за 200 прадпрыемстваў, якія выпускаюць усе віды *тканін*. Баваўняныя тканіны, ніткі, нятканыя матэрыялы выпрабляюць з прывазной бавоўны. *З якіх краін завозіцца бавоўна?* Найбуйнейшае прадпрыемства па іх вытворчасці знаходзіцца ў Баранавічах (мал. 153). Працуюць баваўняныя фабрыкі таксама ў Ветцы, Кобрыне, Рэчыцы.

Вытворчасць шаўковых тканін у Беларусі пачала інтэнсіўна развівацца пасля стварэння ўласнай сыравіннай базы — прадпрыемстваў па вытворчасці хімічных валокнаў і нітак. *Дзе выпрабляюць хімічныя валокны?* Буйнейшыя прадпрыемствы размешчаны ў Магілёве і Віцебску (мал. 154).

Асноўнымі цэнтрамі вытворчасці ваўняных тканін з’яўляюцца Гродна, Мінск, Пінск, Слонім. Дываны выпрабляюць у Віцебску і Брэсце. У апошнія гады назіраецца скарачэнне выпуску ваўняных тканін. Раней іх выпраблялі з прывазной сыравіны. У цяперашні час акрамя прывазной тонкай мерыносавай воўны пры вытворчасці гэтага віду тканін выкарыстоўваюць лаўсан, нітрон, ільняныя валокны.

**Мінск (1)**

**«Камволь», «Сукно»:** ваўняныя тканіны
**«Элема», «Цэнтр моды»:** адзенне
**«Алеся», «Мілавіца», «Серж Фэшн»:** трыкатаж
**«ЛУЧ», «Ле гранд»:** абутак
**«Галантэя»:** скураныя сумкі, рамяні

**Мінскае вытворчае гарбарнае аб'яднанне (2):** гарбарная прадукцыя
**Смілавіцкая валюшна-лямцавая фабрыка (3):** валёнкі
**«Эліз» (4):** адзенне
**«Світанак» (5):** трыкатаж
**«Марк Фармэль» (6, 7):** трыкатаж

**«Калінка» (8):** адзенне
**«Купалінка» (8):** трыкатаж

**Віцебск (9)**

**Віцебскі камбінат шаўковых тканін:** тканіны
**«Віцебскія дываны»:** дываны
**Віцебскі футравы камбінат:** футравае адзенне
**«КІМ»:** трыкатаж
**«Васіліна»:** шкарпэткі
**«Белвест», «Марко»:** абутак

**Аршанскі льнокамбінат (10):** ільняныя сталовыя, пасцельныя, гарнітурна-плаццевыя тканіны, пража

**Гродна (17)**

**«Гроднатэкстыль»:** ваўняныя тканіны
**«Элод»:** адзенне
**«Контэ Спа»:** калготкі, шкарпэткі, трыкатаж
**Гродзенскае вытворчае гарбарнае аб'яднанне:** гарбарная прадукцыя
**«Нёман»:** абутак

**Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка (18):** ваўняныя тканіны
**Лідская абутковая фабрыка (19)**




1. Мінск
2. Гатава
3. Смілавічы
4. Дзяржынск
5. Жодзіна
6. Заслаўе
7. Узда
8. Салігорск
9. Віцебск
10. Орша
11. Магілёў
12. Бабруйск
13. Гомель
14. Брэст
15. Баранавічы
16. Пінск
17. Гродна
18. Слонім
19. Ліда

**«Стужка», «Магатэкс» (11):** шаўковыя тканіны
**«Вяснянка» (11):** адзенне
**«Гарбарнік» (11), Бабруйскі гарбарны камбінат (12):** гарбарная прадукцыя
**Бабруйская абутковая фабрыка (12)**

**Брэст (14)**

**Брэсцкі панчошны камбінат:** калготкі, шкарпэткі
**«Дываны Брэста» (14):** дываны
**«Блакіт» (15):** бабаўняныя тканіны, ніткі, пасцельная бялізна, абрусы і сурвэткі, ручнікі, бінты, марля

**Баранавіцкая абутковая фабрыка (15):** абутак
**«Палессе» (16):** пража, трыкатаж
**Пінскі завод штучных скур (16):** гарбарная прадукцыя

**Гомель (13)**

**«Камінтэрн»:** адзенне
**«8 Марта»:** трыкатаж, шкарпэткі
**Гомельская абутковая фабрыка**

Мал. 154. Прадпрыемствы лёгкай прамысловасці Беларусі

Самай перспектыўнай у Беларусі з'яўляецца вытворчасць ільняных тканін. Гэта абумоўлена наяўнасцю мясцовай сыравіны і высокім попытам на іх на сусветным рынку. Прадпрыемствы льняной прамысловасці размешчаны пераважна ў раёнах вырошчвання льну-даўгунцу.

*Назавіце раёны вырошчвання льну-даўгунцу.* Адзіны ў Беларусі льнокамбінат у Оршы з'яўляецца найбуйнейшым у Еўропе.

По выпуску тканін лідзіруюць Магілёўская, Брэсцкая і Віцебская вобласці. Вытворчасць баваўняных тканін засяроджана ў Брэсцкай вобласці, шаўковых тканін з хімічных валокнаў — у Магілёўскай, ільняных — у Віцебскай, ваўняных — у Мінску. Якімі прычынамі абумоўлена такая рэгіянальная канцэнтрацыя вытворчасці?

**Геаграфія швейнай вытворчасці.** Швейная вытворчасць добра развітая ў Беларусі. Прадстаўлена буйнымі фабрыкамі і дробнымі прадпрыемствамі. Пераважная колькасць швейных вырабаў выпускаецца ў буйных гарадах. Вядучымі з'яўляюцца прадпрыемствы ў Гомелі, Гродне, Дзяржынску, Мінску, Магілёве, Салігорску. Па вытворчасці галаўных убораў вылучаецца фабрыка ў Мінску. Пашыў швейных вырабаў з натуральнага і штучнага футра наладжаны ў Віцебску. Сыравінай з'яўляюцца шкуркі жывёл, што пастаўляюцца зверагаспадаркамі краіны, і штучны мех (Жлобін). Значная частка прадукцыі гэтых прадпрыемстваў ідзе на экспарт: у краіны СНД, Вялікабрытанію, Данію, Польшчу, ЗША, Нідэрланды, Чэхію і інш.

*Трыкатажная вытворчасць* прадстаўлена прадпрыемствамі, якія выпускаюць трыкатажнае палатно, панчошна-шкарпэткавыя вырабы. Выкарыстоўваецца пераважна мясцовая сыравіна. Трыкатажныя вырабы выпускаюцца ў многіх гарадах Беларусі буйнымі прадпрыемствамі, невялікімі атэлье, індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Самыя значныя прадпрыемствы размяшчаюцца ў Віцебску, Гомелі, Жодзіна, Заслаўі, Мінску, Пінску, Салігорску, Уздзе. Панчошна-шкарпэткавыя вырабы выпускаюцца ў Брэсце, Віцебску, Гомелі, Гродне. Шырока вядомая прадукцыя мінскіх фабрык жаночай бялізны «Мілавіца» і «Серж Фэшн».

**Вытворчасць скуры, вырабаў са скуры і абутку.** Пры вырабе скуры выкарыстоўваецца мясцовая сыравіна: натуральныя і штучныя скуры. Найбуйнейшае прадпрыемства па вытворчасці *скуры* знаходзіцца ў пасёлку Гатава пад Мінскам. Буйныя прадпрыемствы таксама ў Магілёве, Гродне, Бабруйску. У Пінску працуе завод штучных скур. *Скураную вопратку* выпускаюць у Віцебску, пальчаткі — у Гродне. Таксама з натуральнай і штучнай скуры мінская фабрыка «Галантэя» вырабляе шырокі асартымент жаночых і мужчынскіх *сумак*, чамаданаў і іншай прадукцыі. Для вырабу *абутку* выкарыстоўваецца мясцовая і прывазная сыравіна. Буйнейшым цэнтрам па вытворчасці абутку з'яўляецца Віцебск, дзе размешчаны холдынг «Беларуская гарбарная кампанія "Марко"» і «БелВест». Буйныя абутковыя прадпрыемствы знаходзяцца ў Баранавічах, Бабруйску, Гомелі, Гродне, Лідзе, Мінску. Спартыўны абутак выпускаюць у Лідзе, валёнкі — у Смілавічах.

**Абагульнім і запомнім.** Галоўныя фактары размяшчэння лёгкай прамысловасці — спажывецкі і наяўнасць працоўных рэсурсаў.
Тэкстыльная вытворчасць з'яўляецца самай буйной па аб'ёме выпускаемай прадукцыі.

1. Назавіце асноўныя фактары размяшчэння лёгкай прамысловасці. 2. Якія прадпрыемствы тэкстыльнай прамысловасці працуюць на мясцовай сыравіне, якія — пераважна на прывазной? 3. Назавіце буйныя прадпрыемствы па вытворчасці тканін у Беларусі.

4. Чым выклікана рэгіянальная канцэнтрацыя вытворчасці прадукцыі лёгкай прамысловасці? 5. Чаму ў Беларусі ў апошнія гады назіраецца скарачэнне выпуску ваўняных тканін? 6. Якія, на ваш погляд, перспектывы развіцця лёгкай прамысловасці?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце рэкламны буклет прадукцыі лёгкай прамысловасці і прадстаўце ў ім беларускія брэнды.

## § 39. Геаграфія харчовай прамысловасці

***Узгадваем.*** *Прывядзіце прыклады прадукцыі харчовай прамысловасці.*

**Асаблівасці развіцця і фактары размяшчэння вытворчасці харчовых прадуктаў.** Вытворчасць прадуктаў харчавання ў краіне — гэта сучасная галіна, якая дынамічна развіваецца і прадпрыемствамі якой выпускаецца больш за чвэрць прадукцыі апрацоўчай прамысловасці, што забяспечвае харчовую бяспеку краіны. У Беларусі выпрабляюцца амаль усе неабходныя прадукты харчавання на прадпрыемствах дзяржаўнай і прыватнай формаў уласнасці. У сувязі з вялікай разнастайнасцю прадукцыі харчовая прамысловасць уключае больш за 20 вытворчасцей, кожная з якіх мае свае асаблівасці (мал. 155). Дзякуючы мадэрнізацыі і ўкараненню сучасных тэхналогій прадпрыемствы галіны выпускаюць прадукцыю, якая карыстаецца попытам як на ўнутраным рынку, так і за мяжой.

Асноўны ўплыў на размяшчэнне прамысловасці аказваюць сыравінны і спажывецкі фактары. На крыніцы сыравіны арыентуюцца вытворцы цукру, алею, крухмалу, на спажыўца — тыя, хто выпускае хлеб і хлебабулачныя вырабы, малако, кандытарскія вырабы. Некаторыя вытворчасці (мяса і мясапрадуктаў, мукамольна-крупяной прамысловасці) імкнуцца як да крыніц сыравіны, так і да спажыўца. Са з'яўленнем новых транспартных сродкаў (аўтарэфрыжэратары), паляпшэннем транспартных шляхоў сыравінны фактар становіцца больш уплывовым. Эканамічна больш эфектыўнымі становяцца сярэднія і малыя прадпрыемствы.